http://edoc.bseu.by:8080

*А.М. Ненадавец*
*УА БДЭУ (г. Мінск)*

# ПАРАЎНАЎЧЫ АНАЛІЗ ДЭМАНАЛАГІЧНЫХ ПЕРСАНАЖАЎ «РЫЖАЯ ЛІСА» (КІТАЙСКІ) І «КУМА-ЛІСКА» (БЕЛАРУСКІ)

Міфалогія любога народа ўключае ў сябе глабальную сістэму ўяўленняў аб Сусвеце і чалавеку, якая ўтварылася ў перыяд фарміравання патрыярхальнай самасвядомасці, але гэта зусім не азначае, што гэта нейкая навука (галіна), статычная ці незмяняльная. Любая міфалогія таксама прайшла працяглы і пакручасты шлях развіцця – ад самых прымітыўных міфаў, якія тлумачаць паходжанне або асобныя ўласцівасці жывёл і птушак, ці апавядаюць аб падарожжах продкаў па «тым» і «гэтым» свеце, і ажно да ўтварэння найскладанейшых і найтрывалейшых культаў вышэйшых язычніцкіх боствaў, іхняга пантэона, шматлікіх дэманалагічных персанажаў, непахіснай веры ў пярэваратніцтва.

Элементы міфалагічнай карціны свету захоўваюцца ў народнай свядомасці на працягу гісторыі разам з элементамі філасофскіх і навуковых ведаў. Апісанне мадэлі свету і апавяданні (пра ўзнікненне прыродных і культурных аб’ектаў, пра дзеянні багоў і герояў) у сукупнасці складаюць той фон, якім карыстаюцца нашчадкі як у мысліцельнай дзейнасці, так і ў мастацкай творчасці – пры стварэнні пазнейшай паэтычнай сюжэтыкі і вобразнасці.

У грамадстве міфалогія амаль заўсёды выконвала рэгулятыўныя функцыі і выступала галоўным сродкам мабілізацыі гістарычнага вопыту дзеля яго актуальнага выкарыстання. У аснове ўсеагульнага закону жыцця Сусвету – ідэя пастаяннага ўзнаўлення традыцыйнай формы. Глыбінная мэта чалавечай жыццядзейнасці – пазнаць рытмы і цыклы Сусвету. Адпаведна аснову ментальных установак калектыўнага творцы каляндарна-абрадавай паэзіі складае ідэя вечнага паўтарэння, а таксама ідэя нязначнасці і хуткаплыннасці чалавечага жыцця ў параўнанні з касмічнай гісторыяй. Галоўнай каштоўнасцю быцця з’яўлялася спасціжэнне вышэйшага сакральнага сэнсу, а не рэалізацыя канкрэтных мэт. Жыццё ўяўляе сабой быццам бы бясконца працяглы рэлігійны ці касмаганічны рытуал (абрад), у якім удзельнічаюць багі і людзі, звяры і птушкі.

Міфатворчасць – найважнейшая з’ява ў культурнай гісторыі ўсяго чалавецтва. У першабытным грамадстве міфалогія ўяўляла сабою своеасаблівы спосаб асэнсавання свету і была першапачатковай формай духоўнай культуры тагачаснага грамадства. Тое, што ўспрыняцце свету, навакольных з’яў і прыроды першабытным чалавекам прыняло такую своеасаблівую форму, як міфатворчасць, звязана з асаблівасцямі мыслення, уласцівымі гэтаму ўзроўню культурна-гістарычрнага развіцця. Тады чалавек ніколі не выдзяляў сябе са свету прыроды і свету соцыума (грамадства). Для носьбіта міфалагічнай свядомасці асэнсаванне і эмацыянальнае ўспрыняцце акаляючавага свету былі непарыўныя, непадзельныя. Таму прыродныя з’явы і аб’екты па-свойму быццам бы «ачалавечваліся»: у міфах яны персаніфікаваныя, гэта азначала, што ім прыпісваліся людскія рысы, уласцівасці, дзеянні. Нядзіўна таму, што Сонца «каціла па небе на залацістай калясніцы», а рэкі нагадвалі сабою крываносныя аорты маці-Зямлі, а звяры атрымлівалі здольнасць да пярэваратніцтва.

Нас не здзіўляе, што змест міфа для носьбіта міфалагічнай свядомасці ўспрымаецца як рэальнасць, а не як майстэрская выдумка; канкрэтнай («цвёрдай») мяжы паміж рэальным і звышнатуральным не існуе. Больш таго, падзеі міфа амаль заўсёды асэнсоўваюцца як «вышэйшая рэальнасць», як заканамерная аснова, на якой усё адбываецца ў наступныя эпохі. У міфе адлюстраваны калектыўны і практычны вопыт многіх пакаленняў, якія і злучылі мінулае і сучаснае. Таму менавіта гэты вопыт, скумуляваны ў мудрасці продкаў і традыцыйных устаноўках, разглядаўся пастаянна як трывалая апора існуючага парадку, якая нават не падлягала праверцы, болей таго, не патрабавала (і нават не дапускала) яе. Верагодна таму, што міф як форма асэнсавання акаляючага свету суадносіцца з паняццем веры. Тым болей, калі гаворка вядзецца пра бостваў і дэманалагічных персанажаў надзвычай даўніх часоў. У першую чаргу гэта датычыцца кітайскай дэманалогіі, у якой «рыжая лісіца» выступала ці не самым галоўным вобразам. І не толькі ў пярэваратніцтве, але і ў некаторых іншых аспектах.

Як адзначаў Я. Дэ Гроот: «Ужо ў Старажытным Кітаі лісіцы валодалі дурной славай прадвеснікаў зла, бо яшчэ ў «Шы цэнне» мы чытаем:

Край гэты страшны – рыжых лісіц краіна.

Прызнак злавесны – крумкачоў зграя чорная.

Чжу Сі так тлумачыць гэтыя радкі: «Лісіца – звер, які прыносіць няшчасце, і людзі асцерагаліся сустрэч з ёю. І, калі ў якім-небудзь месцы нельга было ўбачыць нічога іншага, акрамя іх, гэта сведчыла, што дзяржава падвяргаецца небяспецы і асуджана да разладу» [1, с. 97].

Яшчэ ў трэцім стагоддзі да новай эры аб здольнасці лісіцы тварыць зло і аб усемагчымых павер'ях, звязаных з яе пярэваратніцтвам, разважаў Чжуан-цзы. Паводле ягоных слоў вынікала, што «лісіцы заўсёды асацыіраваліся са злымі духамі». У кітайскай традыцыі на многія стагоддзі засталося перакананне ў тым, што «лісіца – носьбіт хвароб, пры гэтым, невылечных, яна запроста можа ўцелаісціцца ў чалавека і ператварыць яго ў ... ідыёта». Не здзіўляе, што гэтага звера баяліся і ненавідзелі за здольнасць «тварыць зло», якое, найчасцей, праяўлялася ў цяжкіх хваробах і ўсемагчымых разумовых парушэннях у людзей, бо менавіта на іх гэта ўсё і было скіравана. Ужо пасля ханьскай дынастыі лісіцы сталі прыпісваць імкненне да «пераўтварэння ў чалавечы воблік» і яднання з праявамі д'ябальскіх сілаў. Такіх звяроў называлі «ху мэй», «ху цзін» ці «ху гуай», што азначала сабою «лісіца-дэман» ці «лісіца-прывід».

Многія кітайскія міфы сведчаць пра тое, што галоўная небяспека пярэваратняў-лісіц заключалася не толькі ў тым, што яны насылалі і разносілі хваробы сярод людзей, а ў тым, што яны здзяйснялі гэтыя злыя намеры, зыходзячы з уласнай ініцыятывы, якая, найчасцей, правакавалася іхняй асабістай злонамернасцю. І свае норавы (характары) яны змяняюць надзвычай марудна і ... неахвотна. У «Сюань чжун цзі» (тэкст перыяду шостага стагоддзя нашай эры) гаворыцца наступнае: «Калі лісіцы спаўняецца пяцьдзесят гадоў, яна можа пераўтварыцца ў жанчыну; калі ёй споўніцца сто гадоў, яна становіцца прыгажуняй, ці валодаючай духам (шэнь), ці дарослым мужчынам, які ўступае ў адносіны з жанчынамі. Гэтыя істоты здольныя знаць пра тое, што адбываецца

за тысячу гадоў ад іх; яны могуць труціць людзей пры дапамозе чараўніцтва, ці авалодваць імі, ці прыводзіць іх у замяшальніцтва, і ад гэтага людзі губляюць памяць і розум, а калі лісіцы спаўняецца тысяча гадоў, яна ўздымаецца на Неба і становіцца Нябеснай лісіцай» [1, с. 103–104].

Часам народныя дарадцы надзялялі лісіц-пярэваратняў чарадзейнымі ўласцівасцямі таму, што яны, быццам бы, валодаюць таямнічай жамчужынай, якая на самой справе з'яўляецца іхняй душой. Паводле старажытных павер'яў, лісіца здольна ў любы момант выклікаць агонь, ударыўшы для гэтага хвастом аб зямлю. Лічылася таксама, што калі лісе ўдавалася ўкрасці ў чалавека хоць некалькі ягоных валасоў, то ён станавіўся цалкам залежным ад волі звера. Сцвярджалася, што раскрыць каварнасць лісіц-пярэваратняў можна не толькі параніўшы ці забіўшы іх або напусціўшы зграю сабак. Гэта могуць здзейсніць вопытныя вучоныя-кніжнікі, свяшчэннікі, манахі і магі-чараўнікі.

У адрозненне ад кітайскай, беларуская дэманалогія намнога «маладзейшая», і рысы-асаблівасці «кумы-лiскі» раскрываюцца ў фантастычных і чарадзейных казках, якія ў айчынным фальклоры адносяцца да найбольш старажытнага пласта вуснапаэтычнай творчасці. Менавіта ў такіх творах даследчыкі адшукваюць карані развіцця грамадскай узаемаабумоўленасці ў дачыненні паміж беднымі і багатымі. У іх могуць адначасова дзейнічаць звяры і жывёлы, людзі і птушкі ці ўсе разам. У даўнія часы чалавек найбольш задумваўся над тым, як выжыць у жорсткім супрацьстаянні з прыродай, са стыхіямі, існасці якіх ён не разумеў і таму тлумачыў іх, сыходзячы з уласнага пункту гледжання на тое, што адбывалася навокал. Такое мастацкае асэнсаванне рэчаіснасці падрыхтавала глебу для ўзнікнення ў межах гэтага віду казачнага эпасу казак-алегорый («Ліса-каталічка») [2, с. 438].

Так, яна вельмі хітрая, можна нават сказаць, што кемлівая ад прыроды. Таму, відаць, нездарма ж яе ў фальклорах розных народаў узнагародзілі дзясяткамі імёнаў, прозвішчаў, мянушак. У беларускай вуснапаэтычнай творчасці найбольш папулярныя: «лісічка-пакуратнічка», «лісічка-перамудрычка», «лісіца-сястрыца», «кумка-галубка», «сястра Мар'яна», «рыжуха-лісуха», «лісуха-сяструха», «ліс, што ўсіх чыста перагрыз» і г. д. І калі сюды

дадаць варыянты з украінскага і расійскага фальклору, то пералік гэты становіцца даволі ўражваючым: «лис-курежерун», «звір-лисица», «лисица, всим сповидниця», «лисичка-сестричка», «лиса-ласковые словеса», «лиса, сахарные уста», «лиса, сахарные уста, ласковые словеса, льстивый язык», «лисица-красавица», «лиса-кумушка», «лисица – маслена губица» [2, с. 439].

У паасобных выпадках нібы сцвярджаецца, што каго ні стаў супраць лісы, а яна ўсё роўна адолее, апынецца зверху ды яшчэ і смяяцца-заходзіцца будзе. Такі ўжо ў яе, рыжухі, нораў, такое ўжо правіла яна сабе спрадвеку завяла. Калі абкручвала вакол пальца гаспадара і той здагадацца не мог, што да чаго, то пра жонку ягоную і гаворкі нават весці не даводзілася. З жанчынамі ліса ўвогуле распраўлялася вельмі проста. Вось як у казцы «Ліска абманула бабу, ваўка, мядзведзя» [2, с. 440].

Вось так, падсумоўваючы вышэйпрыведзенае, хацелася б адзначыць, што ліса, паводле беларускай фальклорнай традыцыі, выступае з традыцыйнымі героямі: чалавекам, мядзведзем, ваўком, зайцам і некаторымі іншымі. Здавалася б, невялікі пералік герояў і што тут новага можна было б прыдумаць? Але на самай справе ўсё даволі складаней, бо тыя, хто ствараў казкі, утварылі мноства варыянтаў, сітуацый, канфліктаў, сцэнак, у якіх «характар» лісы праяўляўся ў самабытнай шматграннасці. Яна выступала і дарадчыцай, і хітрай зладзейкай, і пакаральніцай багатых, і нават суддзёй, які, праўда, судзіць сабе на карысць.

І яшчэ адна асаблівасць дэманалагічнага персанажа «кумы-лiскі». Яна ніколі не выступала ў беларускай міфалогіі і фальклоры ў якасці пярэваратня, бо гэтую ролю ў нашай вуснапаэтычнай творчасці, як і ўвогуле ва ўсходнеславянскай, выконваў іншы драпежнік – воўк.

## Літаратура

1. Де Гроот. Демонология древнего Китая / Пер. с англ. Копченко Р.В. – Спб.: Издательская группа «Евразия», 2000. – 352 с.

2. Ненадавец, А.М. Нарысы беларускай міфалогіі / А.М. Ненадавец. – Мінск: Беларус. навука, 2013. – 535 с.